**РЭЗАЛЮЦЫЯ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛ БЕЛАРУСІ**
**да Канферэнцыі «Новая Беларусь» 2026**

# АБ АБАРОНЕ АДУКАЦЫІ АД ПАЛІТЫЧНАЙ ІНДАКТРЫНАЦЫІ, МІЛІТАРЫЗАЦЫІ І РУСІФІКАЦЫІ

8–9 жніўня, Варшава

Усведамляючы сваю адказнасць за лёс беларускага народа і яго наступных пакаленняў, моўнай і культурнай спадчыны Беларусі і нацыянальнай ідэнтычнасці;

Зыходзячы з таго, што сістэма адукацыі Беларусі ўсё больш выкарыстоўваецца для палітычнай індактрынацыі, мілітарызацыі, насаджэння культу асобы А. Лукашэнкі, ажыццяўлення палітычных рэпрэсій, русіфікацыі і падаўлення акадэмічнай свабоды;

Звяртаючы ўвагу на асабліва небяспечнае ўцягванне выхаванцаў дзіцячых садоў і вучняў пачатковых школ у навязванне палітычнай лаяльнасці, ваеннай рыторыкі, ваенізаваных гульняў, рамантызацыі вайны, фармавання культу ўзброенага гвалту і апраўдання расійскай агрэсіі супраць Украіны;

Прызнаючы, што сістэма адукацыі адыгрывае велізарную ролю ў фармаванні нацыянальнай і грамадзянскай ідэнтычнасці, а яе падпарадкаванне расійскай імперскай палітыцы і ідэалогіі «Рускага свету» стварае пагрозу для дзяржаўнага суверэнітэту краіны і самога існавання беларускай нацыі ў сярэднетэрміновай перспектыве;

**Мы, прадстаўнікі беларускіх дэмакратычных сіл,**

**Заяўляем, што** адукацыя не можа быць прасторай прымусу, страху і прапаганды, падпарадкаванай інтарэсам аўтарытарнай улады і знешняга палітычнага ўплыву;

**Рашуча асуджаем** выкарыстанне сістэмы адукацыі ў мэтах палітычнай індактрынацыі, насаджэння культу асобы, прымусу да дэманстрацыі лаяльнасці і ўдзелу ў прапагандысцкіх мерапрыемствах.

**Патрабуем ад рэжыму А. Лукашэнкі і кіраўніцтва адукацыйных устаноў:**

- спынення мілітарызацыі дзіцячых садоў, школ і ўніверсітэтаў, уключаючы ваенізаваныя мерапрыемствы, вайсковыя зборы для непаўналетніх, дэманстрацыю зброі дзецям і падрыхтоўку вучняў і студэнтаў да задач ваенна-прамысловага комплексу;
- спынення палітычных рэпрэсій супраць выкладчыкаў, студэнтаў, школьнікаў і адукацыйных супольнасцяў, перагляду палітычна матываваных звальненняў, аднаўлення парушаных працоўных правоў з прадастаўленнем належнай

кампенсацыі, скасавання фармальных і нефармальных абмежаванняў на прафесійную дзейнасць па палітычных матывах;

- спыненне русіфікацыі сістэмы адукацыі, скарачэння колькасці школ з беларускай мовай навучання, закрыцця школ нацыянальных меншасцей, свядомай дэфармацыі гістарычнай памяці і нацыянальнай ідэнтычнасці;
- аднаўлення паўнавартаснага вывучэння замежных моў у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі адукацыі;
- спыненне практыкі палітычна матываванага запалохвання і абмежаванняў, якія перашкаджаюць беларускім выпускнікам паступаць у замежныя навучальныя ўстановы, а таксама забеспячэння свабоднага і недыскрымінацыйнага атрымання дакументаў, неабходных для працягу адукацыі за мяжой;
- спыненне дзейнасці арганізацый, праграм і інстытутаў, якія выкарыстоўваюцца Расійскай Федэрацыяй для прасоўвання ідэалогіі «Рускага свету», палітычнага ўплыву, мілітарызму, апраўдання агрэсіі супраць Украіны, умяшання ў адукацыйную палітыку Беларусі, у тым ліку «Россупрацоўніцтва», Фонду «Рускі мір», «Фонду публічнай дыпламатыі імя Гарчакова», «Дома Масквы» ў Мінску і іншых падобных структур на падставе празрыстай прававой ацэнкі іх дзейнасці;

**Лічым**, **што:**

аднаўленне аўтаноміі адукацыйных установ, вызваленне іх ад дзяржаўнай прапаганды, палітычнага прымусу і абавязковай ідэалогіі, дэмілітарызацыя і паўнавартасная рэінтэграцыя беларускай адукацыі і навукі ў міжнародную акадэмічную прастору з'яўляюцца неабходнымі ўмовамі дэмакратычнага развіцця краіны;

адукацыя павінна служыць развіццю асобы, крытычнага мыслення і грамадзянскай адказнасці, выхаванню павагі да правоў чалавека, забяспечваць пераемнасць беларускай мовы і культуры і ўмацоўваць здольнасць грамадства самастойна вызначаць будучыню краіны.

**Заклікаем** палітычных партнёраў, дэмакратычныя ўрады, міжнародныя арганізацыі, навучальныя ўстановы і прафесійныя аб'яднанні падтрымліваць:

незалежныя беларускія адукацыйныя ўстановы і ініцыятывы, накіраваныя на захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці, беларускай мовы і культуры, супрацьдзеянне ідэалогіі «Рускага свету»;

праграмы дапамогі рэпрэсаваным педагогам, навукоўцам, студэнтам і школьнікам, якія дапамагаюць заставацца ў прафесіі, атрымаць ці завяршыць навучанне;

праграмы акадэмічнай мабільнасці для беларускай моладзі, якія дазваляюць атрымліваць якасную адукацыю ва ўмовах акадэмічнай свабоды і адсутнасці ідэалагічнага ціску, спрашчэнне візавага рэжыму ці ўвядзенне спецыяльнай бязвізавай праграмы мабільнасці для маладых беларусаў і беларусак ва ўзросце да 25 гадоў;

праграмы падтрымкі беларускіх сем'яў з дзецьмі, якія апынуліся ў вымушанай эміграцыі, накіраваныя на захаванне і развіццё беларускай мовы і нацыянальнай ідэнтычнасці з улікам унікальнага і працяглага характару эміграцыі сотняў тысяч беларусаў.

**Выказваем салідарнасць** з беларускімі педагогамі, навучэнцамі і акадэмічнымі супольнасцямі, якія захоўваюць годнасць, прафесійныя стандарты і вернасць прынцыпам свабоднай адукацыі.

*Офіс Святланы Ціханоўскай,*
*Аб’яднаны Пераходны Кабінет,*
*Каардынацыйная Рада,*
*Платформа палітычных партый*